**Заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусьнародны ансамбль народнай музыкі «Явар» Мазырскага гарадскога палаца культуры**

Калектыў быў створаны ў 1993 годзе. А ўжо праз шэсць гадоў, у 1999 годзе, ансамблю прысвоена найменне «народны аматарскі калектыў». 9 кастрычніка 2013 года За значны ўклад у развіццё беларускай нацыянальнай культуры, папулярызацыю нацыянальных культурных традыцый ансамбль народнай музыкі «Явар» атрымаў ганаровае званне «Заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь».

За гады свайго існавання калектыў пад кіраўніцтвам Аляксандра Сцяпанавіча Бялоцкага дасягнуў значнага прафесійнага майстэрства, дзякуючы чаму канцэртныя выступленні ансамбля сталі больш сталымі і яркімі. Пра гэта гавораць узнагароды, якія калектыў заваяваў на розных рэспубліканскіх і міжнародных конкурсах і фестывалях. Сведчаннем папулярнасці канцэртаў з'яўляюцца поўныя залы слухачоў.

Амаль за тры дзесяцігоддзі сваёй канцэртнай дзейнасці ансамбль заслужыў права называцца песеннай і танцавальнай візітоўкай не толькі горада над Прыпяццю, але і ўсёй Рэспублікі Беларусь. З творчасцю калектыву знаёмыя жыхары Украіны, Расіі, Польшчы, Чэхіі, Германіі. І ўсюды – высокая ацэнка прыхільнікаў і захапленне нацыянальным беларускім мастацтвам, якое ідзе ў артыстаў ад сэрца.

У 2018 годзе калектыў прыняў удзел у абласным аглядзе-конкурсе ансамбляў народнай музыкі, песні і танца і быў узнагароджаны дыпломам 1- й ступені. Папулярнасць калектыву, узровень выканальніцкага майстэрства зрабілі калектыў пастаянным удзельнікам усіх буйных музычных, культурных мерапрыемстваў горада і вобласці.

Жывое гучанне музычных інструментаў (скрыпка, цымбалы, флейта, дудка, баян, гармонік), самабытныя песні, народныя танцы, нацыянальныя касцюмы – усё гэта дапамагае народнаму ансамблю ствараць свой індывідуальны стыль.

